БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________ А. В. Данільчанка
(подпіс)
10.06.2016
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-2437/ уч.

**ЛАЦІНАМОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ**

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці

1-21 05 05 Класічная філалогія

2016 г.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ А. В. Данільчанка
(подпіс)
____________________
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-_____ / уч.

# ЛАЦІНАМОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці

1-21 05 05 Класічная філалогія

2016 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-21 05 05-2013 і вучэбнага плана УВА № D21-070/уч. 2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

**Прыстаўка Ягор Уладзіміравіч,** дацэнт кафедры класічнай філалогіі, к. ф. н., дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай класічнай філалогіі філалагічнага факультэта (пратакол № 8 ад 27.04.2016 г.);

навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 6 ад 31.05.2016 г.).

# I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Лацінамоўная літаратура Беларусі” разлічана на студэнтаў-філолагаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці “класічная філалогія”. Дадзеная дысцыпліна раскрывае асноўныя шляхі рэцэпцыі антычнай літаратурнай традыцыі ў культуры ўсходніх славян. На працягу курса будучыя філолагі-класікі могуць не толькі пазнаёміцца з багатай лацінамоўнай спадчынай Беларусі, але таксама авалодаць навыкамі чытання сапраўдных сярэднявечных тэкстаў. Акрамя лекцыйнага курса, праграма прадугледжвае практыку у перакладзе арыгінальных лацінамоўных помнікаў, лінгвістычным і гісторыка-культурным каменціраванні. Тым самым студэнты маюць магчымасць прымяніць атрыманыя на папярэдніх курсах веды ў галіне лацінскай мовы і антычнай культуры, даследуючы жывыя помнікі лацінамоўнай гісторыі роднай краіны. Выкладанне дадзенай дысцыпліны мае вялікае значэнне для развіцця нацыянальнай свядомасці студэнтаў, іх патрыятычнага і духоўнага выхавання.

**Мэта** выкладання дысцыпліны -- засваенне студэнтамі жанравых, кампазіцыйных і стылістычных асаблівасцей лацінамоўнай літаратуры Беларусі XVI-XVIII стагоддзяў.

**Задачы** вывучэння дысцыпліны:

- даць сістэмныя ўяўленні пра феномен лацінамоўнай кніжнасці на беларускіх землях у XVI-XVIII стагоддзях;
- паказаць спецыфіку лацінамоўных твораў у кантэксце шматмоўнай літаратуры Беларусі XVI-XVIII ст. ;
- выпрацаваць навыкі аналізу перакладу, тлумачэння і каменціравання лацінамоўных твораў.

У сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй дысцыпліна займае важнае месца і непарыўна звязана з такімі дысцыплінамі, як “Лацінская мова і аўтары”, “Гісторыя старажытнагрэцкай літаратуры”, “Гісторыя рымскай літаратуры”, “Антычныя рыторыкі”, “Антычнасць у беларускай літаратуры”.

“Лацінамоўная літаратура Беларусі” ўваходзіць у лік дысцыплін па выбары студэнта, цыкл спецыяльных дысцыплін.

Засваенне дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне наступных **кампетэнцый**:

***1) акадэмічных:***

- умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
- валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;
- валодаць даследчымі навыкамі;
- умець працаваць самастойна;
- валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем;

***2) сацыяльна-асобасных:***

• умець працаваць у калектыве;

***3) прафесійных:***

• працаваць з навуковай, тэхнічнай і патэнтнай літаратурай;

• планаваць, арганізоўваюць і весці навукова-даследчую дзейнасць ў галіне філалогіі;

• прымяняць сучасную метадалогію лінгвістычных і літаратуразнаўчых даследаванняў.

У выніку навучання дысцыпліны студэнты **павінны:**

***-- ведаць*:** перадумовы ўзнікнення лацінамоўнай літаратуры на Беларусі; змест і мастацкія адметнасці лацінамоўнай паэзіі і прозы; шляхі і формы рэцэпцыі антычнай культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім;

***-- умець*:** чытаць і перакладаць сярэднявечныя лацінскія вершаваныя і празаічныя тэксты; складаць гісторыка-філалагічны і міфалагічны каментарый да твораў; выконваць рытарычны аналіз тэкстаў; выкарыстоўваць атрыманыя веды на занятках па іншых прадметах;

***-- валодаць***: базавай літаратуразнаўчай тэрміналогіяй (назвы жанраў, метрычных памераў), навыкамі літаратурнага аналізу лацінамоўных твораў, навыкамі перакладу сярэднявечных тэкстаў.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі: дзённая.

Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, якія адводзяцца на вывучэння вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторнага часу па відах заняткаў, курсах і семестрах, формы бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне.

| | |
|---|---|
| Курс | IV |
| Семестры | VII |
| Агульная колькасць гадзін | 120 |
| Колькасць аўдыторных гадзін | 52 |
| • Лекцыі | 40 |
| • Практычныя (семінарскія) заняткі | 12 |
| • Лабараторныя заняткія | — |
| • КСР | — |
| Форма бягучай атэстацыі | Экзамен |

# II. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### Уводзіны. Гістарычныя і культурныя перадумовы ўзнікнення лацінамоўнай літаратуры на Беларусі.

Палітычнае і сацыяльнае жыццё ў Вялікім княстве Літоўскім у XV-XVI стст. Адукацыйныя вандроўкі беларускіх студэнтаў у XVI ст. Навуковыя і адукацыйныя асяродкі і бібліятэкі. Роля лацінскай кнігі ў культурным жыцці беларускага народа ў XV-XVI стст. Пераклады антычных твораў у Вялікім княстве Літоўскім.

Моўная сітуацыя ў Вялікім княстве Літоўскім у XV-XVI стст. Сферы ўжывання лацінскай мовы. Лаціна – мова тагачаснай навукі, літаратуры, адукацыі, касцёла, адной з моў вялікакняскай канцылярыі. Жанравая разнастайнасць лацінамоўнай літаратуры.

### Ян Вісліцкі і яго паэма “Пруская вайна”.

Праблема вывучэння біяграфіі Яна Вісліцкага. Гіпотэзы пра этнічнае і сацыяльнае паходжанне аўтара (паводле звестак, змешчаных у творах аўтара). Паэма “Пруская вайна” на лацінскай мове (Belli Pruteni tres libelli per Ioannem Visliciensiem editi. 1516, Cracoviae, ab Ioanne Hallero) як мастацкі помнік Грунвальду. Склад і структура кракаўскага выдання, звароты і вершы, якія суправаджаюць твор.

Кампазіцыя паэмы, гіпотэзы аб чарговасці напісання яе раздзелаў. Экспазіцыя ў класічных эпічных творах і ў творы Яна Вісліцкага. Ідэйна-мастацкія і стылістычныя адметнасці паэмы “Пруская вайна”. Вобразы Вітаўта і Ягайлы. Моўныя асаблівасці стылю Яна Вісліцкага.

### Творчасць беларускага гуманіста Мікалая Гусоўскага ў кантэксце лацінамоўнай культуры Адраджэння.

Жыццёвы і творчы шлях Мікалая Гусоўскага. Аргументы на карысць беларускага паходжання паэта. Корпус тэкстаў, якія атрыбутуюцца Гусоўскаму.

Паэма "Carmen de statura, feritate ac venatione bisontis" (‘Песня пра постаць, лютасць і паляванне на зубра’) – твор для адукаваных еўрапейцаў. Гісторыя тэксту паэмы “Песня пра зубра”. Ідэйна-мастацкія адметнасці твора. Апісанне гісторыі роднай краіны, глыбокі гістарызм. Прынцып рэтраспекцыі. Два плана раскрыцця зместу: знешні (апісанне прыроды, палявання на зубра) і ўнутраны (асуджэнне палітыкі братазабойства, тэма паэта і паэзіі). Усходнеславянскі культурны слой у творчасці Гусоўскага.

Паэма Мікалая Гусоўскага «De vita et gestis Divi Hyacinthi» (‘Пра жыццё і подзвігі святога Гіяцынта’). Тэма падзвіжніцтва і служэння хрысціянству. Ідэя неабходнасці вывучэння падзей знакамітых людзей мінулых стагоддзяў. Узмацненне рэлігійнай тэматыкі, падтрымка раннехрысціянскіх прынцыпаў,

жанр “жыція”. Дыдактыка-палемічны стыль паэмы, яе ўплыў на гімнаграфію XVI ст.

**Ян Вісліцкі і Міколай Гусоўскі ў літаратуразнаўчай навуцы.**

Гісторыя вывучэння твораў Яна Вісліцкага і Міколы Гусоўскага. Ацэнка творчасці Яна Вісліцкага і Мікалая Гусоўскага ў працах польскіх даследчыкаў. Беларускія даследаванні твораў Яна Вісліцкага і Міколы Гусоўскага. Уплыў Гусоўскага на Міцкевіча і Сыракомлю.

**Паэтычная і эпісталярная спадчына беларускага гуманіста і асветніка Саламона Рысінскага (1560-1625).**

Саламон Рысінскі – паэт, філосаф, парэміёлаг, педагог, даследчык антычнай літаратуры, перакладчык. Асноўныя вехі жыцця і творчасці.

Панегірычныя творы Саламона Рысінскага: “Monumenta ... diversis persons ... posita” (‘Помнікі … пастаўленыя … розным асобам’), “Rerum ab Christophoro Radivilio ... gestarum ... epitome” (‘Эпітомэ … дзеяў Крыштофа Радзівіла’).

Кампазіцыя, асноўныя тэмы і стылістычныя адметнасці эпісталярнага зборніка “Дзве кнігі лістоў” (Альтдорф, 1587). Лісты аўтабіяграфічнага харакатару, лісты, прысвечаныя пытанням тэорыі літаратуры, лісты філасофскага зместу. Праблема ідэнтыфікацыі асоб, якім адрасаваны пасланні. Каноны эпісталаграфічнага жанру ў зборніку лістоў Саламона Рысінскага.

Навукова-даследніцкая спадчына Саламона Рысінскага: зборнік прымавак, каментарыі да твораў Сенекі, Аўзонія, Авідзія.

**Лацінамоўная паэзія малых жанраў 50-60 гг. XVI ст. (эпіталамы, эпітафіі, вершы на гербы).**

Кніжна-эпіграматычная паэзія як жанр літаратуры: вершы на гербы, вершаваныя прадмовы, эпіграмы на Заіла. Лацінамоўныя вершаваныя творы беларускага гуманіста Сымона Буднага (эпіграмы на гербы Яна Кішкі, Мікалая Монвіда Дарагастайскага).

Панегірычныя вершы і эпіграмы-прысвячэнні гарадам (Кракаву, Гародні, Вільні) у творчасці лацінамоўнага паэта Петра Раізія (каля 1505–1571).

Эпініцыі, эпіталамы і эпіграмы Яна Мылія (? - 1575). Услаўленне подзвігаў Мікалая Радзівіла Чорнага і Філона Кміты-Чарнабыльскага.

**Гераіка-эпічная паэзія Беларусі канца XVI ст.**

Палітычная сітуацыя ў Вялікім княстве Літоўскім напрыканцы XVI ст. Роля інстытута мецэнацтва ў развіцці лацінамоўнай літаратуры. Літаратурна-асветніцкая дзейнасць паэтаў кола Радзівілаў біржайскай лініі. Творчасць Францішка Градоўскага, Андрэя Рымшы, Яна Радвана, Яна Казаковіча (Яна Казака), Гільяша Пельгрымоўскага.

Паэмы «Радзівілаўскага цыкла». Паэма Францішка Градоўскага “Hodoeporicon Moschicum…Christophori Radivilonis” (‘Апісанне маскоўскага паходу князя Хрыстафора Радзівіла’) (1582). Ян Радван і яго героіка-эпічная паэма “Радзівіліяда” (1592). Кампазіцыйныя, жанравыя і тэматычныя адметнасці паэм. Патрыятычныя матывы ў творчасці паэтаў.

**Лацінамоўная аратарская проза ў Вялікім княстве Літоўскім.**

Антычная рытарычная традыцыя ў Вялікім княстве Літоўскім. Аб’ём, структура і канон рытарычнага вучэння. Жанры рытарычнай літаратуры: падручнікі, трактаты, зборнікі цытат, сентэнцый, генеалогій, гамілетыкі, узоры практычнай рыторыкі. Адметнасці празаічных жанраў у літаратуры XVI-XVII стст.

Андрэй Волан (пасля 1530-1610) – палітычны дзеяч, філосаф, правазнаўца, ідэолаг рэфармацыйнага руху на Беларусі і Літве. Біяграфія і творчасць Андрэя Волана. Панегерычныя і палітычныя прамовы Андрэя Волана: тэмы, кампазіцыя, мастацка-стылістычныя адметнасці. Творы “De libertate politica sive civile” (‘Аб палітычнай, або грамадзянскай свабодзе’), “De principe et propriis virtutibus” (‘Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці’) як помнікі рытарычнага мастацтва.

**Літаратурная і навукова-педагагічная спадчына Мацея Казіміра Сарбеўскага (1595-1640).**

Мацей Казімір Сарбеўскі – доктар філасофіі і тэалогіі, арыгінальны тэарэтык паэзіі і рыторыкі, славуты новалацінскі паэт. Жыццёвы і творчы шлях Сарбеўскага. Выкладчыцкая дзейнасць у Крожах, Полацку, Вільні і Рыме і Нясвіжы. Гурток гуманістаў у Віленскай акадэміі пад кіраўніцтвам Мацея Сарбеўскага.

Уклад творцы ў паэтыку і рыторыку. Асноўная праблематыка трактатаў “De acuto et arguto” ('Аб вастрыні і досціпе'), “De perfecta poesi” ('Аб дасканалай паэзіі'). Працы Сарбеўскага па рыторыцы і паэтыцы як крыніцы ведаў па гісторыі мовазнаўства і тэорыі літаратуры.

Лірычная паэзія Сарбеўскага: “Lyricorum liber I”, “Lyricorum liber II”. Праблема аўтарства паэмы «Silviludia» ('Лясныя забавы'). Зборнік эпіграм Сарбеўскага. Гарацыянскія матывы ў творчасці паэта.

**Міхал Карыцкі (1714-1781) –**
**лацінамоўны паэт Беларусі эпохі Асветніцтва.**

Творчая біяграфія Міхаіла Карыцкага, паэта эпохі Асветніцтва. Педагагічная дзейнасць ў Бабруйску, Вільні і Варшаве.

Іерархія жанраў паэтыкі класіцызму ў зборніку вершаў “Carmina” (1778?): эпіка-панегерычныя вершы, элегіі, оды, эпіграмы. Ідэал мудрага і справядлівага дзяржаўнага мужа часоў Асветніцтва ў панегірычнай паэме “Птушыны сейм”. Алегарычнае адлюстраванне тагачасных нораваў.

Мастацкія адметнасці твора: рэтардацыя і адступленні, разгорнутыя параўнанні, вялікая колькасць фігур і тропаў (эпітэт да кожнага назоўніка).

Тэма Айчыны ў творчасці Міхала Карыцкага (элегіі “Антонію Пшэздэцкаму”, эпіграма “Да князя Караля Радзівіла па яго вяртанні з замежжа”, эпіграма “Да Фелікса Тавянскага”). Міхал Карыцкі – пачынальнік класіцызму як творчага метаду, уплыў яго паэзіі на лацінамоўную паэзію Польшчы і ВКЛ эпохі Асветніцтва.

**Францішак Князьнін (1750-1807)**
**як прадстаўнік сентыменталізму ў новалацінскай паэзіі.**

Жыццё і творчасць Францішка Князьніна. Адукацыя ў езуіцкіх школах Полацка, Нясвіжа і Слуцка. Праца пры двары князя А.К. Чартарыйскага.

Жанравая разнастайнасць творчасці Францішка Князьніна (пісаў паэмы, ідыліі, элегіі, оды, байкі, гераічна-патрыятычныя п’есы, лібрэта).

Паэтычны зборнік “Carmina” (Варшава, 1781). Аўтабіяграфічны пачатак у творах Францішка Князьніна (вершы “Элегіякон”, “Юзефу Ляшчынскаму”, “Сельскія забавы”). Асноўныя рысы эстэтычнай канцэпцыі Францішка Князьніна. Анакрэантычныя матывы ў творчасці пісьменніка.

**Новалацінская літаратура Беларусі XVI-XVIII стст. у перакладах на беларускую і рускую мовы.**

Гісторыя перакладаў новалацінскай літаратуры ў Польшчы, Украіне, Беларусі і Літве. Мастацкія, стылістычныя і метрычныя адметнасці перакладаў з лаціны Віктара Дарашкевіча, Якава Парэцкага, Язэпа Семяжона, Наталлі Арсенневай, Алеся Жлуткі, Жаны Вацлаваўны Некрашэвіч-Кароткай. Прыярытэты ў даследаванні і публікацыі помнікаў беларускай нацыянальнай лацінамоўнай спадчыны.

Параўнальны аналіз перакладаў паэмы “Песня пра зубра”, выкананых Язэпам Семяжонам, Уладзімірам Шатонам і Наталляй Арсенневай.

# III. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

| Нумар раздела, тэмы | Назва раздела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | КСР | Кіруемая самастойная работа | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| **1.** | **ФЕНОМЕН ЛАЦІНАМОЎНАЙ КНІЖНАСЦІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ** | **4** | | | | |
| 1. 1. | **Уводзіны. Гістарычныя і культурныя перадумовы ўзнікнення лацінамоўнай літаратуры на Беларусі.** Палітычнае і сацыяльнае жыццё ў Вялікім княстве Літоўскім у XV-XVI стст. Перадумовы і чыннікі Рэнесансу на беларускіх землях. | **2** | | | | |
| 1.2. | **Лацінская мова і лацінская кніга ў культурным жыцці Беларусі XV-XVI стст.** Моўная сітуацыя ў ў Вялікім княстве Літоўскім у XV-XVI стст. Роля навучальных устаноў у распаўсюдзе лацінскай адукацыі. Адукацыйныя вандроўкі беларускіх студэнтаў у XVI ст. | **2** | | | | |
| **2.** | **ЛАЦІНАМОЎНАЯ ПАЭЗІЯ ПАЧ. XVI СТ.** | **10** | **4** | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.1 | **Ян Вісліцкі і яго паэма “Пруская вайна”.** Праблемы вывучэння біяграфіі Яна Вісліцкага. Кампазіцыйныя, ідэйна-мастацкія і стылістычныя адметнасці паэмы “Пруская вайна”. Эпічныя і панегірычныя матывы паэмы. | 2 | | | | |
| 2.2. | Антычныя рэменісцэнцыі ў паэме “Пруская вайна” | | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 2.3. | **Творчасць беларускага гуманіста Мікалая Гусоўскага ў кантэксце лацінамоўнай культуры Адраджэння.** Жыццёвы і творчы шлях Мікалая Гусоўскага. Элегічная паэма "Carmen de statura, feritate ac venatione bisontis" (‘Песня пра постаць, лютасць і паляванне на зубра’) зубра”. | 2 | | | | |
| 2.4. | **Паэма Мікалая Гусоўскага “Новая і славутая перамога над туркамі…” (Кракаў, 1524)**. Тэма вайны і міра ў паэме. Мастацкія вобразы паэмы. Мікалай Гусоўскі і традыцыі антычнай літаратуры. | 2 | | | | |
| 2.5. | **Рэлігійныя матывы ў творчасці Гусоўскага.** Паэма Мікалая Гусоўскага «De vita et gestis Divi Hyacinthi»: тэма падзвіжніцтва і служэння хрысціянству. Прыкметы жыційнага і палемічнага жанраў у паэме. | 2 | | | | |
| 2.6. | Пераклад і каментаванне фрагментаў паэмы “Песня пра зубра”. | | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 2.7 | **Ян Вісліцкі і Мікола Гусоўскі ў літаратуразнаўчай навуцы.** Ацэнка творчасці Яна Вісліцкага і Міколы Гусоўскага ў працах польскіх даследчыкаў. Беларускія даследаванні і пераклады. | 2 | | | | |
| **3.** | **ЛАЦІНАМОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА Ў ІІ ПАЛ. XVI – XVII СТ.** | **20** | **8** | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.1. | **Паэтычная і эпісталярная спадчына беларускага гуманіста і асветніка Саламона Рысінскага.** Саламон Рысінскі – паэт, педагог, перакладчык. Панегерычныя творы Саламона Рысінскага “Monumenta ... diversis persons ... posita” (‘Помнікі … пастаўленыя … розным асобам’), “Rerum ab Christophoro Radivilio ... gestarum ... epitome” (‘Эпітомэ … дзеяў Крыштофа Радзівілі’). Зборнік “Дзве кнігі лістоў” (Альтдорф, 1587) як помнік гуманістычнай эпісталярнай культуры.” | 2 | | | | |
| 3.2. | **Лацінамоўная паэзія малых жанраў 50-60 гг. XVI ст. (эпіталамы, эпітафіі, вершы на гербы).** Кніжна-эпіграматычная паэзія як жанр літаратуры. Лацінамоўныя вершаваныя творы беларускага гуманіста Сымона Буднага. Панегірычныя вершы і эпіграмы-прысвячэнні гарадам у творчасці Пятра Раізія (каля 1505–1571). Эпініцыі, эпіталамы і эпіграмы Яна Мылія (? - 1575). | 2 | | | | |
| 3.3. | **Героіка—эпічная паэзія Беларусі канца XVI ст.** Палітычная сітуацыя ў Вялікім княстве Літоўскім напрыканцы XVI ст. Роля інстытута мецэнацтва ў развіцці лацінамоўнай літаратуры. Літаратурна-асветніцкая дзейнасць паэтаў кола Радзівілаў біржайскай лініі. Патрыятычныя матывы ў творчасці паэтаў. | 2 | | | | |
| 3.4. | **Паэма Ф. Градоўскага “Апісанне маскоўскага паходу князя Хрыстафора Радзівіла”.** Паэмы «Радзівілаўскага цыкла». Паэма Францішка Градоўскага “Hodoeporicon Moschicum…Christophori Radivilonis” (‘Апісанне маскоўскага паходу князя Хрыстафора Радзівіла’) (1582). | 2 | | | | |
| 3.5. | Пераклад і каментаванне фрагментаў паэмы Ф. Градоўскага “Апісанне маскоўскага паходу князя Хрыстафора Радзівіла” | | **2** | | | Вуснае апытанне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.6. | **Ян Радван і яго героіка-эпічная паэма “Радзівіліяда”.** Кампазіцыйныя, жанравыя і тэматычныя адметнасці паэмы. Прыкметы класічнай эпічнай паэмы ў “Радзівіліядзе”. Вобраз Айчыны ў паэме і антычны топас “locus amoenus”. Эпічныя вобразы герояў і анты-герояў. | 2 | | | | |
| 3.7. | Пераклад і каментаванне фрагментаў паэмы “Радзівіліяда” | | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 3.8. | **Лацінамоўная аратарская проза ў Вялікім Княстве Літоўскім**. Антычная рытарычная традыцыя ў Вялікім Княстве Літоўскім. Андрэй Валан: біяграфія, творы. Творы “De libertate politica sive civile” (‘Аб палітычнай, або грамадзянскай свабодзе’), “De principe et propriis virtutibus” (‘Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці’) як помнікі тагачаснай грамадска-палітычнай думкі | **2** | | | | |
| 3.9. | “Прамова да сената” Андрэя Волана: аналіз кампазіцыі і рытарычных сродкаў | | **2** | | | Вуснае апытанне |
| 3.10. | **Лаціномоўныя гісторыяграфічныя і этнаграфічныя трактаты ў Вялікім Княстве Літоўскім.** Трактат Міхалона Ліцвіна “De moribus Tartarorum, Litvanorum et Moschorum”. Моўныя і этнічныя пытанні. Легенда пра Палямона. | **2** | | | | |
| 3.11. | **Літаратурная і навукова-педагагічная спадчына Мацея Казіміра Сарбеўскага (1595-1640).** Жыццёвы і творчы шлях Мацея Казіміра Сарбеўскага. Унёсак Сарбеўскага ў паэтыку і рыторыку. Лірычная паэзія Сарбеўскага. Гарацыянскія матывы ў творчасці паэта. | 2 | | | | |
| 3.12. | **Эпіграмы Мацея Казіміра Сарбеўскага: тэорыя і практыка “досціпу”.** Трактат “De acuto et arguto” і традыцыя барочнага канцэптызму. Мастацкія сродкі стварэння “досціпу”. | 2 | | | | |
| 3.13. | Рэфлексійныя і рэлігійныя оды М.К. Сарбеўскага. Гарацыянскія матывы ў творчасці паэта. | | 2 | | | Вуснае апытанне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.14. | **Гераічная паэма Хрыстафора Завішы "Караламахія" (1606).** Праблема аўтарства. Гістарычны падмурак, кампазіцыя паэмы. Ідэйна-мастацкія асаблівасці паэмы. | 2 | | | | |
| **4.** | **ЛАЦІНАМОЎНАЯ ПАЭЗІЯ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XVIII СТ.** | **6** | | | | |
| 4.1. | **Міхал Карыцкі (1714-1781) – лацінамоўны паэт Беларусі эпохі Асветніцтва** Творчая біяграфія Міхаіла Карыцкага. Паэтычныя творы Карыцкага. Іерархія жанраў паэтыкі класіцызму ў зборніку вершаў "Carmina" (1778?). Панегірычная паэма "Птушыны сейм": мастацкія адметнасці твора. Тэма Айчыны ў творчасці Карыцкага. | **2** | | | | |
| 4.2. | **Францішак Князьнін (1750-1807) як прадстаўнік сентыменталізму ў новалацінскай паэзіі.** Жыццё і творчасць Францішка Князьніна. Паэтычны зборнік "Carmina" (Варшава, 1781): мастацкія адметнасці. Анакрэантычныя матывы ў творчасці пісьменніка. | **2** | | | | |
| 4.3 | **Новалацінская літаратура Беларусі XVI-XVIII стст. у перакладах на беларускую і рускую мову.** Гісторыя перакладаў новалацінскай літаратуры ў Польшчы, ва Украіне, Беларусі і Літве. Пераклады паэмы "Песня пра зубра": параўнальны аналіз. | 2 | | | | |

# IV. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## 1. Літаратура

### *Асноўная*


1. [Вісліцкі, Ян] Ioannis Visliciensis Bellum Prutenum=Ян Вісліцкі. Пруская вайна: На лацінскай і беларускай мовах / уклад, перакл., камент. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай. – Мінск : Прапілеі, 2005.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў. Т.1: Даўняя літаратура. XI – першая палова XVIII стагоддзя. – Мінск: Беларуская навука, 2006. – С. 309 – 357.
3. Гусоўскі, Мікалай. Да святога Себасцьяна. Малітва да святой Ганны. Пра чутку, што нечакана ўзнікла ў касцёле святога Лаўрэнція ў Дамасе // Наша вера. 2001. № 4. С. 43-45.
4. Гусоўскі, Мікалай. Пра жыццё і подзвігі святога Гіяцынта (фрагменты) / пераклад з лацінскай мовы Ж. Некрашэвіч-Кароткай) // Наша вера. 2007. № 3. С. 56-61.
5. Гусоўскі, Мікола. Песня пра зубра / пераклад з лацінскай Я. Семяжона. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1973.
6. Гусоўскі, Мікола. Песня пра зубра: На лацін., беларус., рус. мовах / [пер. на беларус. мову Я. Семяжона, пер. на рус. мову Я. Парэцкага і Я. Семяжона; пер. прысвяч. паэмы Боне Сфорца, паслясл., камент. і бібліягр. В. Дарашкевіча]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980.
7. Гусоўскі, Мікола. Песьня пра зубра / пер. У. Шатона. – Мінск : БГАКЦ, 1994.
8. Гусоўскі, Мікола. Песьня пра зубра / пер. Н. Арсенневай // Крыніца.
– 1997. – № 7. – С. 3-32.
9. Некрашэвіч-Кароткая, Ж.В. Шматмоўная літаратура Беларусі ў кантэксце актуальных літаратуразнаўчых канцэпцый : дапаможнік / Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая. – Мінск : БДУ, 2015. – 207 с.
10. Прыстаўка, Я.У. Лацінскі трактат Мацея Казіміра Сарбеўскага «Аб вастрыні і досціпе» (1619/1623 гг.) і яго месца ў гісторыі ведаў аб мове і камунікацыі. – Мінск : БДУ, 2011.
11. Radvanas, Jonas. Radviliada / parengė, įvadą, komentarus ir asmenų žodynėlį parašė, ił lotynų kalbos vertė Sigitas Narbutas. Vilnius : Vaga, 1997.

12. Sarbiewski, Macej Kazimerz. Liryki oraz Droga rzymska i fragment Lechiady / przeł. T. Karyłowski TJ, oprac. M. Korolko przy współudziale J. Okonia. – Warszawa, 1980.
13. Sarbiewski, Macej Kazimerz. Wykłady poetyki (Praecepta poetica) / Macej Kazimerz Sarbiewski ; przeł. i oprac. Stanisław Skimina. – Wrocław-Kraków, 1958.
14. Volanas, Andrius. Rinkiniai raštai / sudarė Marcelinas Ročka ir Ingė Lukšaitė. Vilnius : Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1996.

### *Дадатковая*

1. Дорошкевич, В. И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI века / В. И. Дорошкевич. – Минск: Наука и техника, 1979. – 208 с.
2. Иванов, Вяч. Вс. Славянские диалекты в соотношении с другими языками Великого княжества Литовского / Вяч. Вс. Иванов // Славянское языкознание : XIII Международный съезд славистов. Любляна, 2003 г. Доклады российской делегации. – Москва, 2003. – С. 285–288.
3. Кавалёў, С. В. Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст / С. В. Кавалёў. – Мінск: Універсітэцкае, 1993.
4. Кавалёў, С. В. Літаратура Беларусі позняга Рэнесансу: Жанры, творы, асобы / С. В. Кавалёў. – Мінск: БДУ, 2005.
5. Махнач, Т.М. Сарбеўскі Мацей. Бібліяграфія / Т.М. Махнач // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. ім. Я.Купалы АН Беларусі ; пад рэд. А.В. Мальдзіса. – Мінск, 1992–1995. – Т. 5 : Пестрак – Сяўрук. – 1995. – С. 256–257.
6. Парэцкі, Я. Міхаіл Карыцкі / Я. Парэцкі. – Мінск: Універсітэцкае, 1991.
7. Парэцкі, Я. Ян Вісліцкі / Я. Парэцкі. – Мінск: Універсітэцкае, 1991.
8. Порецкий, Я. И. Соломон Рысинский: Solomo Pantherus Leusorussus. Конец XVI – нач. XVII в. / Я. И. Порецкий. – Минск: Изд-во БГУ, 1983.
9. Порецкий, Я. И. Николай Гусовский / Я. И. Порецкий. – Минск: “Наука и техника”, 1984.
10. Сазонова, Л.И. Поэзия русского барокко (вторая половина XVII-начало XVIII в.) / Л.И. Сазонова. – М. : Наука, 1991. – 263 с.
11. Stawecka, K. Maciej Kazimierz Sarbiewski. Prozaik i poeta / K. Stawecka. – Lublin: Wydaw. T-wa Nauk. Katolickiego Uniw. Lubelskiego, 1989. – 199 s.

*2. Электронныя рэсурсы*

1. Сайт кафедры класічнай філалогіі БДУ www.graecolatini.by.

## ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Гістарычныя і культурныя перадумовы ўзнікнення лацінамоўнай літаратуры на Беларусі.
2. Жанравая разнастайнастаць лацінамоўнай літаратуры.
3. Праблемы вывучэння біяграфіі Яна Вісліцкага.
4. Паэма Яна Вісліцкага “Bellum Prutenum”.
5. Жыццёвы і творчы шлях Міколая Гусоўскага.
6. Элегічная паэма Міколая Гусоўскага "Carmen de statura, feritate ac venatione bisontis"
7. Паэма Міколая Гусоўскага “Nova et miranda victoria de Turcis”: элегічны эпініцый у гонар Усявышняга.
8. Паэма Міколая Гусоўскага «De vita et gestis Divi Hyacinthi».
9. Беларускі гуманіст Саламон Рысінскі: жыццёвы шлях і творчая спадчына
10. Зборнік “Epistolarum libri duo” Саламона Рысінскага як помнік гуманістычнай эпісталярнай культуры.
11. Панегірычныя творы Саламона Рысінскага.
12. Героіка-эпічная паэзія Беларусі канца XVI ст.
13. Ян Радван і яго героіка-эпічная паэма “Радзівіліяда”.
14. Панегірычныя і палітычныя прамовы Андрэя Волана.
15. Трактат Андрэя Волана “De libertate politica sive civile” як помнік тагачаснай думкі
16. Этычныя погляды Андрэя Волана паводле трактата “De vita beata sive summo hominis bono”
17. Жыццёвы і творчы шлях Мацея Казіміра Сарбеўскага.
18. Лірычная паэзія Мацея Казіміра Сарбеўскага.
19. Міхал Карыцкі – лацінамоўны паэт Беларусі эпохі Асветніцтва
20. Францішак Князьнін як прадстаўнік сентыменталізму ў новалацінскай паэзіі

## СРОДКІ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ НАВУЧАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

1. Справаздача па хатніх практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай.
2. Кантрольная работа.

3. Экзамен.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА КАНТРОЛІ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

Выніковая адзнака па дысцыпліне фарміруецца на падставе трох дакументаў:

1. Правілы правядзення атэстацыі студэнтаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ад 29.05.2012 г.
2. Палажэнне аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ад 18.08.2015 г.
3. Крытэрыі ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнтаў па 10-бальнай шкале ад 22.12.2003 г.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне, якая вывучаецца | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
| --- | --- | --- | --- |
| 1. Тэорыя літаратуры | Кафедра тэорыі літаратуры | Узгоднена | Змены не патрабуюцца. Пратакол № 8 ад 27.04.2016 г. |
| 2. Гісторыя беларускай літаратуры | Кафедра гісторыі беларускай літаратуры | Узгоднена | Змены не патрабуюцца. Пратакол № 8 ад 27.04.2016 г. |
| 3. Гісторыя замежнай літаратуры | Кафедра замежнай літаратуры | Узгоднена | Змены не патрабуюцца. Пратакол № 8 ад 27.04.2016 г. |
| 4. Рыторыка | Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры | Узгоднена | Змены не патрабуюцца. Пратакол № 8 ад 27.04.2016 г. |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ**
**ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА**

на _____/_____ навучальны год

| № п/п | Дапаўненні і змены | Падставы |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і ўхвалена на пасяджэнні кафедры

_________________________ (пратакол №____ад________201_г.)
(назва кафедры)

Загадчык кафедры

____________________________ ___________ _____________________
(вучоная ступень, вучонае званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

____________________________ ___________ _____________________
(вучоная ступень, вучонае званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)